ДЗВІНСКІ ЎЗГОРАК

Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець
у будучую сінь

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №3 (128)
ЛЮТЫ 2021 ГОДА

АБСУРДРД ДНЯ

ШТРАФ ЗА ЦЫТАТУ З БІБЛІІ

«Калі ўладарыць бязбожнік – народ стогне» – гэтак гаворыцца ў біблійных прыпавесцях. 56-гадовая Валянціна Крыштопенка сфатаграфавалася з гэтай цытатай на плакаце ў розных месцах пасёлку Акцябрські Віцебскага раёну. Міліцыянты пабачылі фотаздымкі ў «Тэлеграме» і завялі супраць жанчыны справу паводле ч.3 арт. 23.34 КаАП. 11 лютага суд Віцебскага раёну прызнаў Крыштопенку вінаватай…

Справу Валянціны Крыштопенкі разглядаў суддзя Міхаіл Зубеня.

Паводле міліцэйскага пратаколу, 24 снежня 2020 году жанчына, аказваецца, «узяла ўдзел у несанкцыянаваным пікетаванні»: «стаяла з плакатам «Когда господствует нечестивый, народ стенает» у розных месцах пасёлку». На думку супрацоўнікаў МУС, гэтым самым Крыштопенка і парушыла заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. Міліцыянты сцвярджалі, што відэаролік, створаны на падставе фотаздымкаў, быў размешчаны абвінавачанай у тэлеграм-канале «Віцебск 97%».

Валянціна Крыштопенка сваёй віны не прызнала і заявіла, што ролік у «Тэлеграме» не размяшчала. На яе погляд, артыкул 23.34 быў ужыты да яе неправамерна. «Біблія ў Беларусі не забароненая!» – канстатавала яна на судзе. Больш ніякіх тлумачэнняў не давала.

Суддзя Міхаіл Зубеня, спаслаўшыся на ранейшыя пакаранні жанчыны, прызнаў яе вінаватай і пакараў штрафам у памеры 40 базавых велічынь (1160 рублёў). Валянціна Крыштопенка мае інваліднасць 1-й групы і жыве з пенсіі.

Нагадаем, на самым пачатку 2021 году (3 студзеня) у кватэры Валянціны Крыштопенкі міліцыянты правялі ператрус, у выніку якога канфіскавалі плакат з біблійнай цытатай і два тэлефоны.

Валянціну Крыштопенку ўжо тройчы судзілі летась паводле арт. 23.34 КаАП за ўдзел у пратэставых акцыях. Першы раз папярэдзілі, другі раз аштрафавалі на 7 базавых велічынь, трэці раз – на 25 базавых. Новы штраф (40 б.в.) – амаль максімальны.

Зміцер Міраш.
"Віцебская вясна"

COVID-19

«НІЧОГА БЛІЗКАГА ДА ЗАКОНУ»

3 лютага Віцебскі абласны суд разгледзеў тры скаргі на пастановы суду гораду Наваполацку, скаргу на рашэнне Пастаўскага раённага суду і скаргу на рашэнне суду Першамайскага раёну Віцебску. Усе пяць рашэнняў судоў першай інстанцый суддзі Святлана Іванова і Ірына Смалякова пакінулі без зменаў, а скаргі без задавальнення.

Журналіст-фрылансер з Паставаў Зміцер Лупач аспрэчваў прысуд раённага суду ад 22 снежня. Паводле судовай пастановы па артыкуле 22.9 КаАП журналіст быў аштрафаваны на 47 базавых велічыняў (1269 рублёў). Суд прызнаў Лупача вінаватым у тым, што без акрэдытацыі ў якасці журналіста замежнага СМІ ён узяў інтэрв'ю у двух жыхароў вёскі Драздзы Пастаўскага раёну. Пазней відэасюжэт быў размешчаны на ютуб-канале «Белсату», што, на погляд суду, з'яўляецца незаконным вырабам прадукцыі СМІ.

У сваёй скарзе журналіст спасылаўся на парушэнне судом Канстытуцыі, міжнародных прававых нормаў. Пераконваў, што суд не падаў неабвержных доказаў яго віны. Прасіў адмяніць пастанову, а справу спыніць праз адсутнасць у ягоных дзеяннях складу правапарушэння.

У судзе Лупач скаргу падтрымаў і заявіў, што ютуб-канал не з'яўляецца СМІ. Адзначыў, што ў справе ёсць памылкі. Сцвярджаў, што відэасюжэт быў адзняты не 7 снежня, як пераконвалі сведкі, а 30 лістапада.

Суддзя Святлана Іванова аргументы, выказаныя Лупачам, пад увагу не ўзяла і падставаў для адмены рашэння Пастаўскага суду не знайшла. Пакінула пастанову без зменаў, а скаргу без задавальнення.

75-гадовага навапалачаніна Анатоля Куліка паводле ч.3 арт. 23.34 навапалацкі суд прызнаў вінаватым у несанкцыянаваных шэсцях і сваёй пастановай аштрафаваў на 50 базавых велічынь (1350 рублёў).

Разгляд скаргі Анатоля Куліка суддзя Святлана Іванова пачала з таго, што загадала прыбраць накінутую паўз плечы бел-чырвона-белую палярыну. Навапалачанін спачатку адмовіўся выканаць загад суддзі, але пасля замяніў бчб-палярыну на чорную, якую суддзя нібыта і не заўважыла. Гэткім чынам Анатоль Кулік спрабаваў звярнуць увагу суддзі на штучнасць і надуманасць абвінавачанняў з боку судоў і міліцыі.

Выкладаючы свае аргументы, Анатоль Кулік параўнаў паводзіны сілавых структураў у рэагаванні на бел-чырвона-белыя сімвалы з рэакцыяй быка на чырвоную анучу. Навапалацкі актывіст заклікаў суддзю не ўдзельнічаць у «гэтым вар'яцтве».

«Не ўдзельнічайце ў гэтым. Я вас прашу. Адыдзіце, станьце збоку. Усё, што цяпер робіцца ў судах не мае нічога блізкага да закону і паважлівага стаўлення да правоў чалавека», – выказаўся Кулік.

Не зважаючы на працяглыя тлумачэнні Куліка і выступ ягонага адваката, Святлана Іванова рашэнне суду Наваполацку не адмяніла, а скаргу не задаволіла.

Ян Сведка

Чытайце сайт Віцебскага раёна:
http://vicebskreg.by

КАМЕНТАР ПРАВААБАРОНЦЫ

НА «СУТКІ» Ў ГАРАДОК

Адміністрацыйны працэс паводле арт. 23.34 КаАП у справе 13 віцяблянаў прайшоў 30 студзеня ў памяшканні Першамайскага РАУС у закрытым рэжыме і скончыўся апоўначы. Дзевяцёх затрыманых суддзя Веранiка Барысава пакарала 15 суткамі арышту, але пасля прысуду іх не змясцілі ў віцебскі ІЧУ, а адвезлі ў Гарадок. Чаму? Каментуе праваабаронца Ірына Траццякова.

«Магчыма, нехта вырашыў: «Давайце ўскладнім жыццё яшчэ больш – адправім віцяблян у Гарадок!» Палічылі, што якая-ніякая адлегласць перашкодзіць перадаць асуджаным прадукты харчавання, адзежу, асабістыя рэчы. Але Гарадок знаходзіцца ўсяго ў паўгадзіны язды ад Віцебску! І 2 лютага арыштаваныя ўжо атрымалі першыя перадачы. Безумоўна, ёсць у гэтым і момант псіхалагічнага ўздзеяння на арыштаваных. Дый пасля вызвалення людзей, канечне, не прывязуць у Віцебск. Іх проста выкінуць за браму гарадоцкага ІЧУ», – выказала меркаванне Траццякова.

Па словах праваабаронцы, судовае паседжанне адмыслова зрабілі паказальным.

«Я адназначна магу сцвярджаць, што гэта свайго роду зачыстка перад Усебеларускім народным сходам 11-12 лютага. Усё робіцца для таго, каб нейтралізаваць у горадзе актыўную моладзь», – адзначыла Ірына Траццякова.

Незвычайна і тое, што паседжанне прайшло ў суботу. Як тлумачыць Ірына Траццякова, згодна з заканадаўствам у суботу ці нядзелю суды праводзяцца толькі ў выпадку доўгіх выходных, дзяржаўных святаў ці пераносу дзён адпачынку.

Яшчэ адзін момант: суд праходзіў у вячэрні час і пасля 22 гадзінаў у будынку РАУС.

«Суддзя выйшла на працу ў свае выходныя, але чаму затрыманых не даставілі ў суд? Судовае паседжанне адкрытае, аднак нікога на яго не пусцілі, бо, па словах супрацоўнікаў, праходзіла ў рэжымнай установе. Але РАУС – не рэжымная ўстанова! Гэта месца грамадскае. Наколькі я памятаю, усе папярэднія суды ў РАУС таксама былі паказальнымі, але яны былі рэальна адкрытымі. Мала таго, што суд 30 студзеня зачынілі праз "рэжымнасць", яго яшчэ правodзілі ў начны час і ў выходны дзень», – выказалася Траццякова.

На думку праваабаронцы, у Віцебску такога яшчэ не было ніколі, калі б па ч.1 арт.23.34 давалі адразу 15 сутак. Усе затрыманыя былі пакараныя па максімуму.

«Нават чацвёра аштрафаваных атрымалі найвялікшыя штрафы, прадугледжаныя першай і трэцяй часткамі. Суд не ўлічыў, што гэта маці, якія маюць няпоўнагадовых дзяцей. Я думаю, што толькі закон не дазволіў суддзі адправіць жанчын на 15 сутак», – кажа праваабаронца.

Ірына Траццякова таксама распавяла, што ў межах гэткай жа «зачысткі» ў Менску многіх грамадзянаў, затрыманых па першай частцы артыкулу, таксама асудзілі на 15 сутак. У сталіцы было затрымала блізу 300 чалавек.

Якаў Дрозд

ПАЛІТЫЧНЫ ПЕРАСЛЕД

ІНЖЫНЕРА ЗВАЛЬНЯЮЦЬ З «ВІЗАСУ»

Ніна Скрыпец – інжынер па выпрабаваннях заводу «Візас» і маці дваіх дзяцей. Адна з затрыманых і пакараных вялікім штрафам у «справе трынаццаці».

4 лютага Ніна Скрыпец атрымала з працы апавяшчэнне аб звальненні «праз скарачэнне штату». Суд адбыўся 30 студзеня, а загад аб звальненні падпісаны 1 лютага. Гэткае супадзенне жанчына лічыць невыпадковым.

Тры дні да суду пасля затрымання Ніна Скрыпец правяла ў ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ). Як пасля распавялі яе калегі, у гэты час на завод да галоўнага інжынера прыходзіў прадстаўнік КДБ. Цікавіўся спадарыняй Нінай і, відаць, «параіў» прыбраць інжынера Ніну Скрыпец з займанай пасады.

«Яшчэ і ў сераду, 3-га лютага, «камітэтчык» прыходзіў. Мне ў кулуарах сказалі, што ёсць загад звольніць мяне з заводу», – кажа Ніна Скрыпец.

Паводле жанчыны, да гэтага яна і так працавала ўсяго па 48 хвілін у дзень – 4 дні на тыдзень. На заводзе вельмі складанае эканамічнае становішча, фонд заработнай платы

(працяг на стар. 2)

ПАЛІТЫЧНЫ ПЕРАСЛЕД

(пачатак на стар. 1)
скарачаецца, але кіраўніцтва прытрымліваецца загаду Лукашэнкі пазбягаць масавага звальнення працоўных.

«Нягледзячы на мізэрны працоўны дзень, мая пасада там неабходная, яна ёсць у штаце, без яе немагчыма праводзіць выпрабаванне станкоў, кантроль і прыняцце станкоў да эксплуатацыі», – распавяла зволънены інжынер.

Ніна тлумачыць, што, не зважаючы на маленькі заробак, працягвала працаваць, бо не хацела лічыцца «дармаедкай». Да таго ж трэба апекавацца дзецьмі. Пры звальненні прапаноўвалі папрацаваць да 25-га траўня тэхнікам, пакуль не выйдзе з дэкрэтнага адпачынку іншая жанчына.

«То бок бяруць кантралёрам, але гэта ўжо паніжэнне пасады і заробку. Да таго ж у гэтым выпадку я трапляю ў наўпроставае службовае падпарадкаванне да свайго мужа – начальніка АТК, што забаронена», – тлумачыць Ніна.

Скрыпец лічыць, што яе звальненне ёсць прыхаваным пераследам за яе палітычныя погляды і актыўную грамадзянскую пазіцыю.

«Звальняцца, канечне, непрыемна. Але сказаць, што я вельмі засмуцілася, – не! Усе мы ведаем, у якой краіне жывём. Непрыемна ад цынічнасці выканаўцаў. Калі мяне затрымалі, то запалохвалі, што зволъняць, пазбавяць інтэрнату, забяруць дзяцей…» – распавядае Скрыпец.

Ніна Скрыпец кажа, што завод «Візас» па-ранейшаму выпускае запатрабаваную прадукцыю, нават на тых абгрызках вытворчасці, якія захаваліся. Аднак існуюць вялікія праблемы з запазычанасцю.

«Нашыя «моцныя гаспадаркі» завод загубілі. Для сённяшняга кіраўніцтва галоўнае – перасядзець, абы не пасадзілі. Нехяк боўтаемся, але ў кіраўніцтва няма зацікаўленасці, таму працоўных не цэняць. Завод тупа дабіваюць. Некаму гэта выгадна», – выказвае занепакоенасць жанчына.

Неўзабаве пасля размовы Ніна Скрыпец паведаміла па тэлефоне, што да яе ў дзверы грукаюцца супрацоўнікі міліцыі, каб даставіць у РАУС. Як стала вядома пазней, яе і яшчэ адну «фігурантку» справы 13-ці Алену Жыхарскую даставілі у аддзяленні міліцыі, дзе адбылася размова (дэталі пакуль невядомыя). Абедзве жанчыны цяпер на свабодзе.

Якаў Дрозд

СУДОВЫ ПЕРАСЛЕД

ПРЫСУД ЮЛІІ КАШАВЕРАВАЙ

На паўтары гады калоніі – за ўдары нагой па міліцэйскім бусе асудзілі 22-гадовую віцяблянку.

23 лютага суд Кастрычніцкага раёну Віцебску завяршыў разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да Юліі Кашаверавай, якую прызнаў вінаватай у наўмысных дзеяннях, якія парушалі грамадскі парадак і прычынілі шкоду чужой маёмасці. Дзеянне кваліфікаванае, як хуліганства. На падставе ч.1 арт. 339 КК суд прысудзіў Кашавераву да пазбаўлення волі на 1 год і 6 месяцаў у калоніі агульнага рэжыму.

Да вынясення прысуду ў судовым паседжанні былі паўторна даследаваныя паказанні Юліі Кашаверавай, якія мелі пэўныя разыходжанні, а таксама параўнаныя два відэазапісы, пададзеныя рознымі бакамі судовага следства.

Як вынікае з канчатковага выраку, суд улічыў аргументацыю, выказаную адвакатам падчас слухання 23 лютага. Замест шасці гадоў зняволення, запатрабаваных пракуратурай паводле ч. 2 арт.339 («Злоснае хуліганства»), дзеянні Юліі Кашаверавай былі перакваліфікаваны на частку 1 арт. 339 («Хуліганства»).

У тэрмін пакарання суд залічыў Кашаверавай час знаходжання пад вартай ад 20 кастрычніка 2020 году да 22 лютага 2021 году.

Суддзя Сяргей Будрэвіч адмовіў у задавальненні грамадзянскага пазову пракурору гораду Віцебску, заяўленага ў інтарэсах аўтагаспадаркі УУС аблвыканкаму. Арышт, накладзены на прыватныя рэчы асуджанай Кашаверавай, суд адмяніў.

Юлія Кашаверава прызнала віну часткова. Яна не адмаўляла, што пасля таго, як ёй не далі аказаць дапамогу пацярпеламу, не стрымалася і нанесла тры ўдары па задніх дзвярах міліцэйскага мікрааўтобуса. Але запэўніла, што па правых бакавых – удараў не наносіла, маску і кепку з супрацоўніка МУС не зрывала.

Пракурор Лабацкі 19 лютага пераконваў, што ўчыненае злачынства звязанае з актыўным непадпарадкаваннем супрацоўнікам МУС пры выкананні імі службовых абавязкаў. Прасіў прызнаць Юлію Кашавераву вінаватай ва ўчыненні злачынства паводле ч. 2 арт. 339 КК і прымяніць у дачыненні да яе ізаляцыю ад грамадства.

Настойваў лічыць яе дзеянні наўмыснымі, якія груба парушалі грамадскі парадак, выказвалі яўную непавагу да грамадства, і суправаджаліся пашкоджаннем чужой маёмасці.

Прасіў прызначыць Кашаверавай пакаранне ў выглядзе зняволення тэрмінам на 6 гадоў з адбываннем у папраўчай калоніі агульнага рэжыму.

Абаронца Кашаверавай звярнула ўвагу суду на супярэчлівыя сведчанні камандзіра звяна АМАПу Аляксея Альхімовіча, з якога Кашаверава нібыта сарвала маску і кепку. Між іншага, ён паказаў, што не бачыў моманту, калі яе зрывалі. Адвакатка настойвала, што супярэчлівыя паказанні Альхімовіча не могуць быць прызнаныя дакладнымі і пакладзенымі ў аснову абвінавачання.

Адвакатка нагадала, што першапачаткова пры выстаўленні абвінавачвання Кашавераву не вінавацілі ў зрыванні маскі, кепкі і ў пашкоджанні бакавых дзвярэй мікрааўтобуса. А дзеянні кваліфікаваліся паводле ч.1 арт. 339 КК (хуліганства). Юлія Кашаверава неаднойчы запэўнівала, што кепку яна падняла з зямлі і перадала іншай дзяўчыне. Момант перадачы зафіксаваны на відэа.

Апытаныя ў судовым паседжанні сведкі паказалі, што пашкоджанне бакавых дзвярэй магло адбыцца ў выніку ўдару аб іх грамадзяніна, якога тады затрымлівалі. Ніхто з апытаных не засведчыў, што пашкоджанні маглі быць зробленыя Кашаверавай.

Яшчэ 2 кастрычніка ў Кастрычніцкім РАУС Кашаверава не адмаўлялася ад таго, што нанесла тры ўдары па задняй частцы аўтамабіля. Прызнанне было зробленае яшчэ да завядзення крымінальнай справы, што сведчыць пра праўдзівасць падабароннай, а паводле ч.1 арт. 169 КПК можа расцэньвацца як яўка з павіннай.

Сыходзячы з гэтага, адвакатка прасіла апраўдаць сваю падабаронную праз адсутнасць у яе дзеяннях складу злачынства паводле ч. 2 арт.339 КК.

У апошнім слове Юлія нагадала, што з самага дзяцінства бацькі вучылі яе дабрыні, узаемадапамозе, клопату аб людзях. Менавіта таму яна і выбрала прафесію медсястры. Будучых медыкаў вучылі дапамагаць пацярпелым людзям незалежна ад іх статусу і ад таго, дзе здарылася бяда.

«4 кастрычніка ў натоўпе я пабачыла чалавека, які ляжаў тварам уніз. Першае, што прыйшло ў галаву, – гэта даведацца, што здарылася, ці не страціў ён прытомнасць, і дапамагчы. У гэты момант я прыгадала маці, за жыццё якой змагалася ўся сям'я», – тлумачыла Юлія.

Дзяўчына некалькі разоў спрабавала падысці да чалавека, а потым міліцыянты ўжылі газ, а на зямлі ўжо нікога не было – невядомы хлопец знік.

«Мне стала крыўдна за сябе, бо не здолела дапамагчы. Так, я прызнаю сваю віну: я ўдарыла па машыне тры разы. Я ўчыніла правапарушэнне, але не судзіце мяне строга. Не пазбаўляйце мяне свабоды!» – скончыла Юлія Кашаверава.

Ян Сведка

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

«ПРАКУРОРСКІ ПРАТЭСТ» НЕ ЗАДАВОЛЕНЫ

Віцебскі абласны суд 10 лютага разгледзеў пратэст на той момант выканаўцы абавязкаў пракурора гораду Віцебску Кірыла Дубава.

Пракурор прасіў адмяніць рашэнні судоў Першамайскага і Кастрычніцкага раёнаў у дачыненні да Таццяны Севярынец, Алены Касновай, Раісы Кухто, Людмілы Камінскай і Людмілы Валадкевіч. Абласны суд пратэст не задаволіў.

Пратэст пракурора Кірыла Дубава разглядалі суддзі Святлана Іванова і Ірына Смалякова.

Нагадаем, пастановамі суддзяў Веранікі Барысавай і Уладзіміра Царыкава адміністрацыйныя справы супраць грамадзянак, затрыманых у лесе пад Віцебскам 13 студзеня (арт. 23.34 КаАП), былі спыненыя праз недаказанасць вінаватасці. Жанчын, якія займаліся скандынаўскай хадой у лесе за чыгуначнай станцыяй «Лучоса», вінавацілі ў несанкцыянаваным пікетаванні.

Пракурор Кірыл Дубаў апратэставаў рашэнні судоў. Паводле пратэсту, суддзямі Барысавай і Царыкавым не былі ў поўнай меры даследаваныя ўсе акалічнасці справы, а высновы былі зробленыя заўчасна «…без належнага даследавання абставінаў правапарушэння». Дубаў патрабаваў пастановы судоў адмяніць і накіраваць справу на новы разгляд.

Фігуранткі справы даводзілі ў абласным судзе, што пракурорскі пратэст не мае пад сабой аніякіх рэальных падставаў. Пераконвалі, што «не трэба шукаць чорную котку ў чорным пакоі».

Таццяна Севярынец заявіла, што ў судовым паседжанні ўсе міліцыянты паказалі, што ні ў кога з затрыманых не бачылі БЧБ-сцягоў і ніякіх лозунгаў ні ад кога не чулі.

«Не бачылі і не чулі. Пры такіх абставінах падставаў для пачатку новага адміністрацыйнага працэсу няма. Мы не хаваліся, займаліся на вачах у грамадзянаў. І калі б я хацела нешта ўчыніць, то, пэўна, не павяла б людзей у Шпілеўскі лес, бо там праглядваецца ўсё наскрозь. Мелі б намер – зайшлі туды дзе бязлюдна», – тлумачыла Таццяна Севярынец.

Суддзі Іванова і Смалякова пастанавілі пратэст пракурора адхіліць, а рашэнні судоў пакінуць без зменаў. Скасаваныя раней справы ў дачыненні ўдзельніц так званага «пікету ў лесе» па-новаму разглядацца не будуць.

Якаў Дрозд

СУДОВЫ ПЕРАСЛЕД

ШТРАФ ЗА РАСПАЎСЮД

10 лютага ў судзе Чыгуначнага раёну Віцебску суддзя Алена Цыганкова, разгледзеўшы адміністрацыйную справу паводле арт. 22.9 КаАП у дачыненні да распаўсюдніцы незалежнай прэсы Таццяны Юхо, аштрафавала яе на 30 базавых велічынь.

Пасля суду Таццяна Юхо патлумачыла, што ў прыватным сектары Віцебску яна раздавала людзям газету «Витебский вестник». Затрымаў яе міліцэйскі патруль. Чалавек, які патэлефанаваў у міліцыю, сцвярджаў, што ў газеце надрукаваныя матэрыялы, скіраваныя супраць міліцыі і АМАП.

«Зразумела, што гэта хлусня. Пісьмовыя паказанні сведкі часткова хлуслівыя. Акрамя той часткі, дзе сцвярджаецца, што я раскідвала газеты ў паштовыя скрыні. Але ж я не збегала, і сведчанні, пададзеныя ў газеце, не носяць экстрэмісцкага ці супрацьзаконнага характару», – кажа Таццяна.

На судзе Таццяна Юхо даводзіла, што арт. 22.9 КаАП выкарыстоўваць у дачыненні да фізічнай асобы, далёкай ад журналістыкі, нельга. Суддзя Алена Цыганкова ейныя довады праігнаравала.

Каб прызнаць Таццяну Юхо вінаватай у справе паводле арт. 22.9 КаАП суддзі Алене Цыганковай хапіла дадзеных, зафіксаваных у пратаколе. Сведка на судзе паказанні не даваў.

«Газета ўтрымлівае аб'ектыўную інфармацыю. Я лічу праўдзівую. Гэтая газета годная таго, каб яе прачытала як мага большае кола асобаў», – лічыць Таццяна.

Сённяшнюю пастанову суду Чыгуначнага раёну Віцебску Таццяна Юхо мае намер абскардзіць у Віцебскім абласным судзе.

Якаў Дрозд

АБ'ЯВА

Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Дзвінскі Ўзгорак" паведаміце рэдакцыі аб гэтым. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то патэлефануйце.


Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Дзвінскі Ўзгорак".

Наша газета стала размяшчацца на партале http://kamunikat.org, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

ЧАМУ ДЫЯЛОГУ НЕ БЫЛО, НЯМА І НЕ БУДЗЕ

Кажуць, у спрэчцы нараджаецца ісціна. Магчыма… Адкуль няўпэўненасць? Яна ад жыцця. Хто і калі апошні раз быў сведкам спрэчкі (дэбатаў, дыскусіі ці нечага падобнага) у СМІ паміж палітычнымі апанентамі?



Мы маем дзве інфармацыйныя рэальнасці, якія практычна ніяк не сутыкаюцца. У адной рэальнасці Беларусь прэзентуюць як донара еўрапейскай стабільнасці, якой зайздросцяць блізкія і далёкія суседзі. У іншай — адзіны палітык у краіне (АП) не можа расслабіцца нават у выходныя. Пра гэта ён прызнаўся ў інтэрв'ю расійскай журналістцы Наіле Аскер-задэ: «Ну, ты ж ведаеш. У нас пратэстуны хадзілі па вуліцах па выходных, таму і выходных не было, калі ўжо так адкрыта казаць».

Вавёрка, якая скапыцілася

Калі няма спрэчак — адпаведна, няма і ісціны. У выніку краіна ў геаграфічным цэнтры Еўропы ўсё больш пачынае нагадваць «Востраў няўдач», дзе ў жыхароў перыядычна ўзнікалі праблемы з адловам кракадзілаў і зборам какосаў (з ростам ВУП і сярэдняй зарплаты ў доларавым эквіваленце).

Адсутнасць спрэчак шчодра кампенсуецца ў афіцыйнай інфармацыйнай рэальнасці размовамі пра агульнанацыянальны дыялог, які вядзецца на так званых «дыялогавых пляцоўках». Па-за межамі ж такіх пляцовак, як паказвае практыка, дыялог паміж прыхільнікамі і апанентамі ўлады прыняў форму допыту.

Пляцоўкі для такога кшталту дыялогаў, як правіла, арганізуюцца ў СІЗА. Вось як свой удзел у дыялогу апісаў АП: «Я ўбачыў людзей (ну, вы ж мяне ў Расіі да гэтага часу падштурхоўваеце — давайце з апазіцыяй, асабліва ваша ліберальнае крыло). Ну вось я і пагаварыў. Я ўбачыў людзей, якія хацелі быць ва ўладзе, імкнуліся прыйсці да ўлады. Я іх выслухаў…».

Крыху статыстыкі. Паводле звестак праваабаронцаў, на 22 лістапада колькасць затрыманняў удзельнікаў пратэстаў перавысіла 30 тысяч, на палітычных апанентаў улады было заведзена больш за 900 крымінальных спраў. Не даводзіцца сумнявацца, што кожнай крымінальнай справе папярэднічаў допыт.

…У мяне няма падстаў сумнявацца ў тым, што ўсе дыялогі «пратэстуноў» са следчымі ажыццяўляліся толькі і выключна ў поўнай адпаведнасці з законам ды толькі і выключна ў рамках.. Ох, нялёгкая гэта работа — штодня апрацоўваць такі аб'ём аператыўнай інфармацыі. Адсюль — вобраз вавёркі ў коле, няздольнай спыніцца: «Вось кола круціцца — ты бяжыш, бяжыш, бяжыш. Напэўна, пакуль, як у народзе кажуць, не скапыцішся, не павалішся».

Артыкул 83, пункт 6

Аднак пакінем вавёрку сам-насам з яе колам і ўявім сабе на хвіліну, што дыялогавыя пляцоўкі з СІЗА перанясуць у тэлестудыі. Ці многае пры гэтым зміняцца? Сумняваюся. Змены, калі і здарацца, то зусім не ў збліжэнні пазіцый удзельнікаў дыскусій…

Для таго, каб у спрэчцы нарадзілася ісціна, мэтай абмеркавання павінен стаць... пошук ісціны. Але сярод родных бяроз і асін тыя, хто спрачаецца, як правіла, занятыя доказам сваёй праваты. Ісціну яны не шукаюць. Яна ім вядомая яшчэ да пачатку спрэчкі. Таму ўсю сваю энергію накіроўваюць на абвяржэнне аргументаў апанентаў. Тут не да выпрацоўкі кансэнсусу. Як бы ад словаў да рукапрыкладства не перайсці.

Але гэта яшчэ палова бяды. Збліжэнне пазіцый у працэсе спрэчкі магчыма толькі пры ўмове знаходжання пункту адліку, з якога пачынаецца разыходжанне. Для палітычных спрэчак у Беларусі такім пунктам з'яўляецца стаўленне да рэферэндуму 1996 года.

Прыгадаем хлопцаў у цывільным, якія выкінулі старшыню ЦВК Віктара Ганчара з ягонага кабінета. Чый загад яны выконвалі? Наколькі гэты загад адпавядаў дзейнай на той момант Канстытуцыі?

Адкрываем тэкст Канстытуцыі. У артыкуле 83 «Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь», які апісвае паўнамоцтвы вышэйшага прадстаўнічага і адзінага заканадаўчага органа дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь, знаходзім пункт 6: «утварае Цэнтральную камісію па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў».

Здавалася б, якія тут магчымыя розначытанні? Тым не менш, вынікі рэферэндуму ЦВК падводзіў пад кіраўніцтвам Лідзіі Ярмошынай, а не Віктара Ганчара.

Такая вось карціна свету

Сказаўшы А, варта гаварыць і Б. Калі прызнаць вынікі рэферэндуму законнымі, не варта здзіўляцца, што «ў 2020-м нам фактычна абвясцілі вайну». Такая афіцыйная ацэнка. Нічога дзіўнага, нічога асабістага і нічога арыгінальнага яна не ўтрымлівае — ідэалагема ворага старая як свет…

3 сакавіка 2003 года лепшыя дзяржаўныя розумы спрабавалі знайсці стрыжнявую ідэю для дзяржаўнай ідэалогіі. Што толькі ні прапаноўвалася: ад патрыятызму да прэтэнзіі Беларусі на ролю донара еўрапейскай стабільнасці, якая ініцыюе правядзенне «Хельсінкі-2». Але 2020 год усё расставіў на свае месцы. Ён паказаў, што мадэль «імітацыйнай дэмакратыі», мадэль «электаральнага аўтарытарызму» (каму як больш падабацца) — не гумавая.

У любой самабытнасці існуе свая мяжа, за якой у тых, хто хоча гуляць у агульнай пясочніцы, пачынаюць фарміравацца праблемы. Перафразую 16-га прэзідэнта ЗША Аўраама Лінкальна: «Можна падманваць частку заходніх партнёраў увесь час, і ўсіх — пэўны час, але нельга падманваць усіх заходніх партнёраў увесь час».

Няздольнасць упісацца ў сучаснасць патрабуе ідэалагічнага абгрунтавання…. Чаму супраць нас настроіліся? Таму што беларуская дзяржава, «нягледзячы на сціплае месца на карце свету, можа дазволіць сабе праводзіць незалежную знешнюю і ўнутраную палітыку. Менавіта ў гэтым прычына. Калі б мы былі слабымі, з намі б разабраліся без гэтых падзей і без вайны».

Справа не ў нас. Свет так уладкаваны, і так ён быў уладкаваны заўсёды…

* * *

Такая вось карціна свету. Яна ўсё яшчэ актуальная для мільёнаў беларусаў. Шляхам дыялогу яе не змяніць. Які тады сэнс абмяркоўваць вынікі «выбараў» з тымі, хто верыць у законнасць рэферэндуму 1996 года? У іх сістэме каштоўнасцяў закон ніякай каштоўнасці не ўяўляе. Юрыдычныя фармальнасці, выкананне працэдуры і іншыя дурасці — толькі перашкода на шляху да мэты, якую вызначыў правадыр.

(скарочана)

Сяргей Нікалюк
"Новы Час"

ВЫНІК

«ПАСЬЛЯ ЛУКАШЭНКІ АД ДЗЯРЖАВЫ ЗАСТАНУЦЦА РУІНЫ»

Кіраўнік праекту Belarus security blog Андрэй Паротнікаў адказвае на пытаньні, наколькі далёка беларускі рэжым гатовы ісьці ў сваіх рэпрэсіях, разважае пра люмпэнізацыю сілавых структураў і канстатуе, што Лукашэнка лічыць сябе палітыкам эўрапейскага маштабу.

Сьцісла:

Рэжым імкнецца запэцкаць у неправавой дзейнасьці максымальна шырокае кола сілавікоў і дзяржаўных службоўцаў

Працэс, які пачаўся ў нулявыя — люмпэнізацыя сілавых структураў, асабліва войска

Служыць афіцэрамі ў войска ідуць людзі, для якіх гэта адзіны даступны сацыяльны ліфт

Менск спрабуе гуляць у геапалітычную гульню ва ўмовах, калі ніхто зь ім гуляць у гэта ня будзе...

— Але калі не шукаць нейкіх схаваных прычын, а аналізаваць тыя факты, якія мы бачым, — то, акрамя прысудаў, мы назіраем і падрыхтоўку да прыняцьця пэўных драконаўскіх законаў. Ці не азначае гэта стратэгічнага курсу на пабудову ўжо не аўтарытарнай, а таталітарнай сыстэмы? Калісьці Лукашэнка сам казаў, што для пабудовы дыктатуры ў Беларусі ў яго проста не хапае рэсурсаў. Цяпер што — знайшліся?

— Трэба памятаць, што ў Беларусі мала значэньня мае, што напісана ў законе, а важна тое, як гэта выкарыстоўваецца. Давайце ўзгадаем хаця б сумнавядомы артыкул у КК аб «дыскрэдытацыі РБ», які існуе шмат гадоў, але ніводнай крымінальнай справы па ім заведзена не было. Таму драконаўскія законы і іх магчымае выкарыстаньне — гэта далёка не адно і тое ж. І ўвогуле бываюць моманты, «калі не да законаў». Беларусь — не прававая дзяржава, таму ня варта рабіць высновы з таго, якія законы прымаюцца. Самае галоўнае — гэта правапрымяняльная практыка.

— У гэтай самай практыцы таксама апошнія тыдні адбываюцца беспрэцэдэнтныя рэчы. Судовы працэс у Берасьці, дзе пацярпелымі выступаюць вайскоўцы сілаў спэцыяльных апэрацый Раман Гаўрылаў і Арсеній Галіцын, сьведчыць пра тое, што падчас пратэстаў для іх падаўленьня выкарыстоўваліся ня толькі міліцыя і ўнутраныя войскі, але і армія, баявыя часткі. Ці было гэта законна і пра што сьведчыць гэты факт?

— Па-першае, гэта законна. Няма ніякіх абмежаваньняў у выкарыстаньні арміі ў тым, што афіцыйна называецца «падтрыманьнем правапарадку», але фактычна зьяўляецца рэпрэсіямі супраць мірных грамадзянаў.

Рэжым рыхтаваўся загадзя да таго, што адбывалася пасьля 9 жніўня. Жорсткасьць, катаваньні, зьбіцьцё — гэта ўсё было загадзя сплянавана і падрыхтавана. У дадзеным выпадку відавочна тое, што рэжым імкнецца запэцкаць у неправавой дзейнасьці максымальна шырокае кола сілавікоў і дзяржаўных службоўцаў. У нашым выпадку — гэта вайсковы генэралітэт.

Гэта сьведчыць пра тое, што пасьля Аляксандра Лукашэнкі ў Беларусі ад дзяржавы застануцца руіны. Я маю на ўвазе дзяржаўныя інстытуты, іхны аўтарытэт, іхную здольнасьць ажыцьцяўляць кіраваньне дзяржавай. Мы цяпер назіраем фактычна развал той рэспублікі, якую 26 гадоў фармаваў Лукашэнка.

— На пачатку размовы вы сказалі, што ўлады «хацелі б выйсьці на пэўную стабілізацыю сытуацыі ўнутры краіны», у тым ліку дзеля таго, каб паспрабаваць зноў наладзіць адносіны з Захадам. Але пакуль стратэгія Лукашэнкі выглядае прыблізна так — «возьмем як мага больш закладнікаў, каб потым гандляваць імі з Захадам». Маўляў, «калі вы будзеце павялічваць санкцыі, мы будзем павялічваць рэпрэсіі супраць сваіх жа грамадзянаў, «бамбіць Варонеж», як кажуць у Расеі. І што Захад можа проціпаставіць такой лёгіцы паводзінаў?

— Захад мог бы шмат што зрабіць з таго арсэналу, які ён мае. Але, шчыра кажучы, ні халеры ня робіць.

Адносна паводзінаў беларускай улады трэба разумець, што ў сваёй сыстэме каардынатаў яны дзейнічаюць даволі рацыянальна. Тое, што журналісткі «Белсату» атрымалі 2 гады — гэта ня значыць, што падчас апэляцыі гэты прысуд будзе пацьверджаны.

Іншы момант. Аляксандар Лукашэнка шчыра верыць, што ён палітык эўрапейскага маштабу. Не парыя, а ўплывовая асоба. Бо Беларусь займае такое важнае геапалітычнае становішча, што безь яе не абыдзесься. Таму Менск спрабуе гуляць у геапалітычную гульню ва ўмовах, калі ніхто зь ім гуляць у гэта ня будзе. І калі Менск зразумее, што гульня не атрымліваецца, — я думаю, мы пабачым шпаркія крокі па дээскаляцыі.

Усе эканамічныя пляны Менску прадугледжваюць нейкія грошы і інвэстыцыі. Адкуль яны зьбіраюцца браць гэтыя грошы? Вядома, толькі на Захадзе.

svabod1.azureedge.net
Віталь Цыганкоў

РОДНАЯ МОВА

ВЫГЛЯДАЕМ ЯК ТЫПОВАЯ АЎТАНОМІЯ РФ

У 1995 годзе ў беларускае мовы забралі статус адзінай дзяржаўнай. У якой групе моваў рэгіёну яна апынулася за 26 гадоў? Ці разам з украінскай, эстонскай, казаскай? Не, яна разам з удмурцкай, башкірскай і комі — у трывожным сьпісе UNESCO. Лічбы і дыяграмы паказваюць: гэта вынік «дзяржаўнага двумоўя».

Дзяржаўныя мовы іншых незалежных «постсавецкіх» краін пашыраюць свае функцыі, расьце колькасьць людзей, якія імі валодаюць, прызнаюць роднымі, карыстаюцца.

Але імкліва падае колькасьць тых, хто валодае і карыстаецца мовамі тытульных народаў расейскіх аўтаноміяў. Там прынамсі па дзьве дзяржаўныя мовы.

Навіны пра моўную палітыку ў аўтаноміях РФ нярадасныя: пратэстуючы супраць моўнай дыскрымінацыі, удмурцкі навуковец спальвае сябе; судзьдзя называе «цыркам» зварот актывіста на мове комі...

Стратэгія ратаваньня беларускае мовы павінна прадугледжваць вяртаньне ёй статусу адзінай дзяржаўнай. Калі гэтага няма — пляны марныя. Будзе як ва Ўдмуртыі.

Навіны пра моўную палітыку ў аўтаноміях РФ нярадасныя: пратэстуючы супраць моўнай дыскрымінацыі, удмурцкі навуковец спальвае сябе; судзьдзя называе «цыркам» зварот актывіста на мове комі... А ці ў нас сытуацыя інакшая?

26 гадоў таму разварот палітычнага курсу афіцыйнага Менску пачаўся менавіта з моўнага пытаньня. Яно было ў бюлетэні рэфэрэндуму 1995 году, які бальшыня незалежных юрыстаў лічыць супярэчным Канстытуцыі і заканадаўству. Быў скасаваны статус беларускае мовы як адзінай дзяржаўнай, у якім яна пабыла ўсяго пяць гадоў. Гэта паслужыла грунтам для аднаўленьня дыскрымінацыі беларускамоўных, для выцісканьня беларускае мовы з бальшыні дзяржаўных і сацыяльных сфэраў ужытку.

…Пасьля непрацяглага росту беларускамоўнай ідэнтычнасьці (была ж і кароткая эпоха «беларусізацыі» 20-х гадоў у БССР) надалей у савецкі час ішоў яе няўхільны, хоць і павольны, спад — па 3–6% кожныя дзесяць год. Тэндэнцыя пераламілася, як толькі беларуская мова стала адзінаю дзяржаўнаю і Беларусь аднавіла незалежнасьць.

У 1999 годзе 73,7% грамадзянаў назвалі беларускую мову роднай (ясна, што 1999 год — зусім не 1993, але моўнакаштоўнасны выбар людзей мае пэўную інэрцыю).

…Паводле крытэраў UNESCO, крытычны парог самаўзнаўленьня для мовы — 30% практычных носьбітаў. Адпаведна ў 2009 годзе беларуская мова трапіла ў Атляс моваў сьвету у небясьпецы UNESCO ўстане vulnerable (аслабленай, уразьлівай).

Беларусы — адзіны зь дзяржаватворчых народаў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, а таксама постсавецкай прасторы, чыёй нацыянальнай мове пагражае небясьпека зьнікненьня.

Пры гэтым Беларусь — адзіная незалежная дзяржава на тэрыторыі былога СССР, у якой мова тытульнае нацыі ня мае статусу адзінай дзяржаўнай, а дзеліць яго з расейскаю моваю.

Я раней ня раз пісаў, што радыкальная й хуткая (20–25% за дзесяць гадоў) зьмена моўнай ідэнтычнасьці — беспрэцэдэнтная для моўных сытуацыяў у сьвеце. Пагатоў для «маладой дзяржавы», у якой, здавалася б, мусіць мацавацца нацыянальна-культурная тоеснасьць.

Сапраўды, сярод моваў дзяржаватворчых народаў гэта нешта надзвычайнае. Але беларускую дынаміку вельмі нагадвае моўнае становішча ў аўтаноміях Расейскай Фэдэрацыі.

Вінцук Вячорка
svabod1.azureedge.net

ПОГЛЯД

ВОЙНА ВСЕ СПИШЕТ?

Они сами на своем съезде сидели с хмурыми лицами, потому что понимали, что все эти речи — не о том.

Марья Ивановна: *Дети, запишите тему урока: «Война и мир».*

Вовочка: *Да ладно! Вы ж ещё моему бате 30 лет назад эту историю рассказывали!*

В анекдоте фигурирует Марья Ивановна, у нас — Александр Григорьевич, но в остальном все по накатанному: он уже почти 30 лет эту историю рассказывает.

Большая половина доклада Александра Лукашенко на Всебелорусском собрании была про войну. Чудо просто, что до космических баталий не дошло. Поскольку наверняка и на Марсе инопланетяне спать не могут — все думают, как навредить властям Синеокой. Даже странно, что генералы до сих пор не доложили.

... Про войну у Лукашенко красочно получается, как в кино. А вот с миром — плохо. Потому что любое предложение о мире разбивается о репутацию докладчика.

Ну, например.

Пенсии. Государство хочет создать специальные фонды, куда белорусы будут отчислять деньги себе на пенсии.

Ага! Разбежались! Мы что, не помним, как у нас пенсионные фонды закрывали, «раскулачивали»?! И кого беспокоило, что люди в них копили средства себе на пенсию? Проходили. Знаем. Ищи дураков.

Экономика. Призыв «шевелиться самим». Так вы же 26 лет из всех орудий лупили по всему, что шевелится. В Беларуси любого можно посадить, разорить, отжать бизнес и еще получить за это звездочки на погоны. И садили, и разоряли, и отжимали. Хоть одному такому отжимале дали по рукам?

Патриотизм. После спецоперации по выбиванию патриотизма ОМОНовскими дубинками и берцами — это тема, о которой действующей власти вообще лучше молчать. Потому что не бывает патриотизма «правильного» или «неправильного». Он либо есть, либо его нет. И когда вы устроили на улицах белорусских городов настоящую охоту на людей в белорусских вышимайках и одежде национальных цветов, то даже не смеете заикаться, что озабочены воспитанием патриотов.

Лопаты. Ну вот почему минчане не берут у ЖЭСов лопаты и не расчищают снег? Почему при соцопросе, который так порадовал Лукашенко, большинство белорусов ответили, что рассчитывают только на себя? Да потому что эта власть лихо умеет только обмануть и обобрать. И ничего хорошего от этой власти люди уже не ждут. Они рассчитывают только на себя, они злы и обижены настолько, что по призыву власти не готовы делать ничего. Даже расчищать снег.

Да и небезопасно это в нынешних условиях, на грани уголовки: массовое мероприя, не так посмотрели в сторону мимо проходящего ОМОНовца, ему не понравилось. И дело готово — «умышленно», «в сговоре», «причинили моральные страдания», «споткнулся», «легкие телесные повреждения мизинца»...

Вот пусть ОМОНовцы снег и чистят! Вместе с судьями! На них налогов хватает — пусть хватит и на снегоуборочную технику!..

И так можно пройтись по каждому пункту «мирной программы» — нет веры. Ни одному обещанию нет веры — ни про зарплаты, ни про деревообработку, ни про образование, ни про рабочие места. Они сами на своем съезде сидели с хмурыми лицами, потому что понимали, что все эти речи — не о том.

Унизить собственный народ, сделать его бесправным в своей стране — это худшее, что могла сделать власть. Это репутация, которую не отмыть. И абсолютно точно это история не о мире.

В этой ситуации уместны не доклады про войну. В этой ситуации уместно только раскаяние. Освободить всех политических узников и попросить прощения. Вот что должен был сделать Лукашенко. Но он продолжает действовать по принципу «война все спишет». Однако хмурые лица участников «съезда» — лучшее свидетельство того, что они, как раз, в этом совсем не уверены.

Светлана Калинкина
belaruspartisan.by

МЕРКАВАННЕ

ИЗ ОБРАЩЕНИЯ К СВЕТЛАНЕ ТИХАНОВСКОЙ

В самом начале своей программы под названием «Стратегия победы белорусов» Тихановская начинает с вопроса: «Если мы всё делаем правильно, почему мы еще не отстояли свою победу?»

Если бы мы вели беседу, я бы уточнил одно слово: а про какую победу вы пишете? Моральная ваша победа неоспорима. Ни гений фдемагогии, ни его пропаганда ничего не смогли с ней поделать. Ни их телевизор, ни газеты, ни пропагандисты — все они оказались бессильны перед вашей моральной победой.

Победа же во властных структурах пока далека. И вы имели шансы одержать властно-номенклатурную победу. Но она бы обернулась катастрофой для белорусов. Вас бы прокляли за эту «победу»-трагедию. И вот почему.

Что ждало бы белорусов в случае победы во властных коридорах сторонников демократии, ваших сторонников? Нечто подобное на войну в Чечне. Почитайте внимательно официальное сообщение о встрече Лукашенко и Путина в Сочи 14 сентября: «…Но главное, я это постоянно говорю, — не переходить черту. Есть красная линия (вам тоже это знакомо и известно больше, чем мне, вам пришлось эти линии чертить по Чечне прежде всего, когда вы стали еще совсем молодым президентом…Пока эти красные линии никто не нарушал».

Захвати в то время ваши сторонники властные кабинеты, одержи властно-номенклатурную победу, Беларусь залили бы кровью войска РФ, как когда-то в Чечне.

«Александр Григорьевич попросил меня сформировать определенный резерв из сотрудников правоохранительных органов. И я это сделал», — сказал Путин.

«Но мы договорились также, что он не будет использован до тех пор, пока ситуация не будет выходить из-под контроля», — добавил он.

Но Бог миловал. Победу одержал менталитет белорусов, которые снимали обувь, перед тем, как встать на скамейку. Каждодневные победы одерживали радостные, счастливые улыбки белорусов. В итоге Путин решил не вводить в Беларусь войска, которые стояли на границе под Смоленском. Решил отправить их в места дислокации.

….И после десятков тысяч арестованных, искалеченных ваших сторонников, убитых граждан и брошенных в застенки детей, когда после демонстрации изуверства страны ЕС повычеркивали из санкционных списков «кошельки» диктатора, скажите, как бы тогда отреагировали ваши партнеры из стран ЕС на кровопролитие в Беларуси?

Согласитесь, дальше высказываний «возмущения», «сожаления» и призывов «прекратить насилие и кровопролитие», «сесть за стол переговоров» дело бы не пошло. И в Роттердаме на бирже по-прежнему продавались бы нефтепродукты из Беларуси и везли бы через прибалтийские порты калийные удобрения.

Кстати. после заявления вашего Координационного совета кремлевские мудрецы сделали вывод. В конце 2020 года они заключили уникальный договор:

Соглашение о сотрудничестве между Министерством внутренних дел Республики Беларусь и Федеральной службой войск национальной гвардии Российской Федерации

Прочитайте пару строк из этого соглашения:

Статья 4 Запросы об оказании содействия

1. Сотрудничество в рамках настоящего Соглашения осуществляется на основании запросов заинтересованной Стороны об оказании содействия (далее — запрос) или по инициативе Стороны, предполагающей, что такое содействие представляет интерес для другой Стороны.

Вы представляете, что они записали? О чем договорились? Сейчас, если вы одержите Победу, в Кремле решат, что их содействие представляет интерес для руководства РБ и ее народа. И спокойно, не мучаясь юридической совестью, направят свои войска в Беларусь заливать кровью вашу победу, о которой вы печетесь в самом начале своей программы….

(скарочана)

Владимир Подгол
«Белапан»

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5, Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: kas_vit@tut.by
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 27.02.2021 у 17.20
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.